ПРАЦОЎНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

Газета для рабочых №4 верасеень 2009 г.

# Чым далей, тым горш

Кіраўніцтва шклозавода “Нёман”, відаць, натхнёнае агульным маўчаннем, і надалей працягвае здзеквацца (а як інакш гэта назваць?) з рабочых. Рэжым скарочанага працоўнага дня працягнуты да Новага году. Але справа не ў гэтым.

Справа ў тым, што адміністрацыя завода (а хутчэй за ўсё – дырэктар ) ці не ведаючы законаў Рэспублікі Беларусь, ці, будучы ўпэўненымі ў беспакаранасці і ўсёдазволенасці, абсалютна не зважаюць на праблемы рабочых.

Інакш як патлумачыць тое, што адбываецца падчас выдачы заробкаў у Бярозаўцы? Нам дзяржаўныя СМІ пастаянна дзяўбуць пра тое, як цяжка было падчас вайны, і як добра пры нашым прэзыдэнце. Але такія чэргі, якія выстройваюцца па заробак, пэўна, былі па хлеб у блакадным Ленінградзе. Людзі займалі чаргу з сярэдзіны ночы, каб атрымаць грошы, заробленыя сумленнай працай! Але ня ўсе змаглі атрымаць іх у першы дзень(і не дзіва, 3500 чалавек у адным касавым акне!), многім давялося прастаяць у чарзе і два дні. Многія, не жадаючы стаяць у натоўпе, ездзілі атрымліваць грошы (паўтаруся, сумленна заробленыя) ў Ліду. А вось цікава, ці былі заўважаныя ў гэтых чэргах хтосці з адміністрацыі завода?

(З’явілася, праўда, інфармацыя, што хтосці напісаў скаргу на супрацьзаконныя дзеянні кіраўніцтва заводу. Ну, пра гэта мы яшчэ пачуем, але добра хаця б тое, што ёсць людзі, якія не баяцца.)

Такую сітуацыю інакш, як прыніжэннем, не назавеш. Што б там не казалі, але ўсе мы жывем па законах рынка – тавар-грошы-тавар і г.д. Рабочы прадае свой тавар – сваю рабочую сілу, свае здольнасці. І павінен атрымліваць годную аплату, і своечасова. Калі не заплоціш своечасова за камунальныя паслугі ці за якісці крэдыт, то з цябе здымуць працэнты. А за тое, што табе затрымалі заробак, працэнтаў ніхто не даплоціць.



***Прынцып “аднаго вакна” ў дзеянні***

Дзе ж справядлівасць?

А справядлівасць з’явіцца тады, калі замест чаргі па грошы рабочыя прыйдуць пад вокны кабінета дырэктара завода, і гучна заявяць: “Мы – людзі, і плаціце нам заробак як па закону”.

Вядома, гэта цяжка – пераступіць праз свой страх. Але здаўна вядома, што толькі страх робіць з чалавека раба. Каб застацца чалавекам, **ВОЛЬНЫМ ЧАЛАВЕКАМ** – трэба перастаць баяцца. Бо наш страх перадасца нашым дзецям, унукам. Што мы пакінем ім у спадчыну? Свой страх? Разам з кватэрай, крэдыт за якую,”шчодра” дадзены дзяржавай на 30-40 гадоў, таксама давядзецца выплочваць дзецям? Ці можа лепей пакінем ім пасля сябе вольную, дэмакратычную краіну, дзе ня трэба нічога і нікога баяцца? Выбіраць – нам, тым, хто жыве сёння. Таму час ужо задумацца. Задумацца над тым, што маўчанне і згодніцтва ні да чаго добрага не давядуць. Калі мы самі не будзем патрабаваць выканання сваіх правоў, ніхто за нас гэтага не зробіць. І наступным разам трэба ісці не ў чаргу па грошы, а выйсці ўсім разам пад вокны дырэктара з транспарантамі: “ Аддайце наш заробак!!!”

А з маўчання нічога не будзе.

***Яська Нязгодны***

***Фота biarozauka.belarda.org***

# Ці верне ЕС Беларусі гандлёвыя прэферэнцыі?

Гэта залежыць толькі ад беларускіх уладаў.

Беларусь была выключаная з Абагульненай сістэмы прэферэнцый у 2007 годзе за парушэнне правоў незалежных прафсаюзаў. Па розных дадзеных, з-за гэтага наша краіна губляе ад 200 да 500 млн.доляраў у год.

Калі ў мінулыя гады для ўладаў гэта не было вельмі важнай праблемай, то сёлета гэтыя грошы не былі б лішнімі для дзяржаўнага бюджэту, а на наступны год – і пагатоў. Таму зараз улады прыкладаюць усе намаганні, каб вярнуць краіну ў сістэму прэферэнцый. Але для гэтага трэба найперш выканаць 12 рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы (МАП). Ды толькі з боку афіцыйных уладаў гучаць адныя абяцанні і дэкларацыі, а насамрэч незалежныя прафсаюзы ў Беларусі надалей застаюцца пад адміністрацыйным ціскам.

У выпадку адсутнасці адказных крокаў з боку беларускіх уладаў па выкананню рэкамендацый МАП, Савет Беларускага Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў мае намер прыпыніць сваё членства ў Нацыянальным Савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях і адклікаць сваіх прадстаўнікоў са складу Савета па ўдасканаленню заканадаўства ў сацыяльна-працоўнай сферы пры Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. У такім разе пра вяртанне прэферэнцый не можа быць і гаворкі.

Для даведкі: пачынаючы з 1971 года, калі былі ўведзеныя гандлёвыя прэферэнцыі, толькі дзве краіны былі іх пазбаўленыя – М’янма і Беларусь.

# Абяцанкі-цацанкі

Нягледзячы на абяцанні кіраўніцтваў прадпрыемстваў, што з верасня ўсе заводы пачнуць працаваць на поўную магутнасць, сітуацыя не толькі не палепшала, але і працягвае пагаршацца. Гэта можна выразна пабачыць на прыкладзе нашага шклозавода “Нёман”: адразу перавялі на няпоўны працоўны дзень на месяц, пасля яшчэ на месяц, зараз яшчэ на тры, і невядома, колькі гэта будзе цягнуцца. Хаця адразу было зразумела, што гэта – надоўга, але ж адміністрацыя не можа афіцыйна прызнаць, што рабочым давядзецца паўгады працаваць за палову заробка, бо можа ўзнікнуць раптоўная незадаволенасць. А так – прывучаюць паступова. Атрымліваецца, пакуль.

У падвешаным стане знаходзяцца такія прамысловыя гіганты, як МАЗ, МТЗ, ММЗ, БелАЗ, “Атлант”, не кажучы ўжо пра дробныя прамысловыя прадпрыемствы. Беларуская прадукцыя не мае попыту на рынках.

Колькасць гатовай прадукцыі на складах крыху памяншаецца, але не за кошт павелічэння продажу, а за кошт скарачэння вытворчасці. Ну а абнадзейваючыя лічбы, якія абвяшчаюць у афіцыйных СМІ – для нашых рапартоўшчыкаў не праблема. Вось толькі лічбы гэтыя, як і абяцанкі, не пакладзеш у кішэню, і дзяцей імі не накорміш.

# Заробкі ў Беларусі

Паводле Белстату, найбольшы сярэдні заробак па рэспубліцы – ў паліўнай прамысловасці, за ліпень ён склаў 1,92 млн.рублёў. Таксама высокія сярэднія заробкі на авіяцыйным (1,66 млн.руб.) і чыгуначным (1,34 млн.руб.) транспарце, у чорнай металургіі (1,63 млн.руб.), хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці (1,45 млн.руб.), электраэнергетыцы (1,43 млн.руб.), а таксама ў навуцы і навуковым забеспячэнні (1,42 млн.руб.).

Сярэдні заробак за ліпень у работнікаў прадпрыемстваў машынабудавання і металаапрацоўкі склаў BR 1,07 млн, лясной, лёгкай — BR696,9 тыс., харчовай — BR1,05 млн, фізічнай культуры і спорту — BR1,17 млн, сувязі — BR1,14 млн, гандлю і грамадскага харчавання — BR929,6 тыс., жыллёва-камунальнай гаспадаркі — BR964,2 тыс., арганізацый сацыяльнага забеспячэння — BR596,9 тыс.

Асобным пунктам хацелася б выдзеліць прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, да якой адносіцца і шклозавод “Нёман”. Сярэдні заробак у гэтай галіне ў ліпені склаў 1,23 млн.рублёў, што амаль у 2 разы болей, чым сярэдні заробак па нашым заводзе. Такое адчуванне, што наша прадпрыемства працуе не толькі ў іншай галіне, але і наогул у іншай краіне, накшталт Паўночнай Карэі.А можа Белстат брэша?

**П.К.**

# Улады баяцца народных пратэстаў



Берасцейскім актывістам дэмакратычных сіл забаранілі правядзенне ўсіх 52 заяўленых пікетаў супраць пагаршэння матэрыяльнага становішча жыхароў рэгіёна.

Акцыі планавалася правесці ў абласным цэнтры 30 верасня. Іх мэта – прыцягнуць увагу грамадскасці і органаў улады да пагаршэння матэрыяльнага становішча насельніцтва, абумоўленага ростам цэн на спажывецкія тавары, зніжэннем пакупніцкай здольнасці і рэальнай зарплаты, а таксама аб'яднаць намаганні грамадзян у барацьбе за свае сацыяльна-эканамічныя правы.

З 52 заявак на правядзенне пікетаў у 47 былі пазначаныя шматлюдныя пляцоўкі Берасця (у буйных гандлёвых аб'ектах) і двары дамоў. Яшчэ пяць акцый планавалася правесці на стыдёне «Лакаматыў» (адзінае месца ў абласным цэнтры, вызначанае гарвыканкамам для такіх мерапрыемстваў), з якіх адна – сумесная. Яе арганізатарамі выступілі гарадскія арганізацыі Партыі камуністаў Беларускай, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), Аб'яднанай грамадзянскай партыі і Партыі БНФ.

Як паведаміла БелаПАН старшыня гарадской арганізацыі БСДП (Грамада) Ганна Канюс, тым, хто падаваў заяўкі на пікетаванне на вуліцах і ў дварах абласнога цэнтра, гарвыканкамам адмоўлена з матывіроўкай, што для гэтага прадугледжаны стадыён «Лакаматыў». Разам з тым, акцыі на гэтым спартовым аб'екце таксама забароненыя на падставе таго, што там 30 верасня адбудзецца штогадовы традыцыйны турнір па футболе, пры гэтым не пазначаецца час яго правядзення.

«Дадзеныя забароны мы расцэньваем як імкненне ўладаў не дапусціць публічнага выказвання сацыяльных і эканамічных праблем, якія хвалююць многіх берасцейцаў, - заявіла Канюс. – Мы абскардзім адмовы ў судзе, бо лічым іх парушаючымі нашыя правы на мірныя сходы і свабоднае выказванне свайго меркавання».

***Паводле Радыё Свабода***

---

# Танная працоўная сіла

Ва Ўзбекістане ідзе бітва за ўраджай бавоўны, на якую мабілізавалі ўзбекскіх школьнікаў. За кілаграм сабранай бавоўны дзеці будуць атрымліваць каля 5 цэнтаў. Фактына, адбываецца прымусовая эксплуатацыя дзяцей. Міжнародныя арганізацыі прводзяць кампанію байкоту тавараў, якія вырабляюцца з узбекскай бавоўны.



***Беларусь: школьнікі вучацца...***

У той жа час на палях Беларусі школьнікі таксама "змагаюцца за ўраджай" бульбы і лёну, замест таго, каб займацца навучаннем. Бо нашым уладам, як і ўзбекскім, па барабану ўсе міжнародныя дамовы-пагадненні-рэзалюцыі, што датычаць правоў чалавека і дзяцей у прыватнасці. Бульбу нашую байкатаваць ня будуць, бо сёлета пра яе экспарт ня можа быць і гаворкі (самім бы хапіла!), а вось каб пачалі байкатаваць тавары з беларускага лёну, то можа і нашыя ўлады крыху задумаліся б, што нельга выкарыстоўваць прымусовую працу дзяцей.

***П.К.***

# За камунальныя паслугі будзем плаціць болей

Па тарыфах, зацверджаных урадам напачатку бягучага году, сярэдні кошт жыллёва-камунальных паслугаў для двухпакаёвай кватэры (48 кв.м), у якой пражываюць 3 чалавека, у ацяпляльны сезон павінен быць каля 163 тысяч рублёў.

Але зараз ва ўрадзе абмяркоўваецца магчымасць падвышэння тарыфаў на паслугі жыллёва-камунальнага сектару для насельніцтва. З 1 лістапада яны могуць павялічыцца ў сярэднім на 5 долараў, а з 1 студзеня 2010г. – яшчэ на 10 долараў.

Такім чынам, кампенсацыя насельніцтвам затратаў прадпрыемстваў ЖКГ у 2009 годзе павялічыцца з 33% да 33,8%, а ў 2010 годзе – да 37,5%.

На сённяшні дзень насельніцтва аплочвае толькі 1/3 ад рэальнага кошту камунальных паслугаў, астатняя частка – а гэта каля 1,7 трлн.рублёў – выдаткоўваецца з дзярж-бюджэта. Але з 2015 года беларусы будуць аплочваць 100% кошту камунальных паслугаў (праўда, Міністэрства ЖКГ настойвае, каб гэта адбылося раней). Але ці падвысяцца нашыя заробкі ў 3 разы да 2015 года, калі ўлады любым коштам намагаюцца захаваць існуючую палітычную і эканамічную сістэму?

Асноўная прычына росту камунальных тарыфаў – рост цэнаў на энерганосьбіты, якія для нашай дзяржавы з кожным годам усё даражэйшыя. А расходы энергіі ў сённяшняй Беларусі перавышаюць сучасныя еўрапейскія нормы энергаспажывання ў некалькі разоў. Калі па еўрапейскіх стандартах энергазатраты на ацяпленне жылля не перавышаюць 37 кВт/г на 1 кв.м. за год, то ў нас, у стандартных шматпавярховіках, у якіх пражывае большасць беларусаў, гэты паказнік складае 100-120 кВт/г на 1 кв.м, а ў многіх дамах, пабудаваных у савецкія часы – наогул 200-250 кВт/г на 1 кв.м.

Будаўніцтва жылля па еўрапейскіх нормах пачнецца ў Беларусі ў наступным годзе. А што ж будзе з тым жыллёвым фондам, які ўжо існуе і які з'яўляецца энергастратным? Іх таксама , з цягам часу, зробяць больш энергаэфектыўнымі, але для гэтага, па падліках спецыялістаў, спатрэбіцца каля 10 млрд.долараў, а такіх грошай на сённяшні дзень у дзяржавы няма. Таму давядзецца пакуль плаціць вялікія грошы за неэфектыўнае жыллё. І з кожным годам гэтыя выдаткі будуць толькі павялічвацца.

*Л.Някозік*

**ЦЫТАТА**

# Калі дзяржава не займаецца коштамі…

***Карэспандэнт газеты "Камсамольская праўда" пацікавіўся ў кіраўніка польскай дыпмісіі ў Беларусі Хэнрыка Літвіна, чаму ў Польшчы прадукты таннейшыя, чым у Беларусі, і ці не з'яўляецца забеспячэнне насельніцтву даступных коштаў на харчаванне палітыкай польскіх уладаў (пры тым, што сярэдні заробак у іх 1150 долараў супраць нашых 365).***

***"Па-мойму, таму таннейшыя, што ў нас адсутнічае палітыка дзяржавы ў гэтым накірунку" – адказаў пасол.***

***Да такога адказу дадаць няма чаго.***

**Паводле КП**

***У Вас праблемы з наймальнікам?***
***Вы лічыце, што Вашыя правы парушаюцца?***
***Напішыце нам на адрас электроннай пошты:***
***hutanioman@gmail.com***
***Кваліфікаваныя юрысты незалежных прафсаюзаў разгледзяць Вашу сітуацыю і пракансультуюць Вас.***
***Бясплатна!!!***

**Працоўная салідарнасць**
*Інфармацыйна-аналітычнае выданне*
*г.Бярозаўка*
*Рэдактар і выдавец П.Кілішкевіч*

*Распаўсюджваецца бясплатна*
*Наклад 299 экз.*
*Друкарня "Вольны працаўнік"*
*Адказны за выпуск Л.Някозік*
*E-mail: hutanioman@gmail.com*